Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Oplatę pocztową uiszczono ryczałtem.

НАША ПРАЎДА

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 12 — Вільня, Субота 14-га траўня 1927 г. — Год I

Паварот эмігрантаў.

З кожным годам лічба беларускіх палітычных эмігрантаў у Заходняй Эўропе таець і корчыцца. Кожны год усё больш і больш людзей, якія пакінулі сваю Бацькаўшчыну, спадзяючыся, што эўрапэйскія дэмакратыі дапамогуць ім у зьдзейсьненьні беларускага незалежніцкага ідэалу,—пакідаюць сваіх „дабрадзеяў“ і ласкавы хлеб іхні ды варочаюцца дамоў.

Мы йшчэ не забыліся аб ліквідацыі А. Цьвікевічам так-званага „Ураду БНР“ і аб пераездзе былых сяброў яго з Прагі, Бэрліну ды Коўны—ў Менск, а вось і галоўны вораг „ліквідатараў“, грам. Ластоўскі, які меў даволі смачны кусок хлеба пры літоўскім урадзе, — і той пакіраваўся туды-ж, напісаўшы адначасна адозву да ўсіх сваіх таварышоў, якія йшчэ бадзяюцца заграніцай, каб пайшлі па ягоных сьлядох...

Што-ж за прычына гоне іх усіх з „цывілізаванага Захаду“ на Усход?!

Прычыны тутака—дзьве.

З аднаго боку, прадстаўнікі беларускае незалежніцкае думкі, якія ехалі на Захад з глыбокай верай у шчырасьць і дапамогу вялікіх дзяржаваў, што так гучна абвяшчалі ў Вэрсалі прынцып самавызначэньня і свабоды ўсіх народаў, — пераканаліся на дзеле, што ніхто і пальцам крануць ня думае, каб падтрымаць іх імкненьне да здабыцьця незалежнасьці Беларусі. Праўда, ім кідалі нейкую жабрацкую дапамогу на пражыцьцё і ў Бэрліне, каб выкарыстываць у палітычнай барацьбе з Польшчай, і ў Коўні, каб вытаргаваць праз іх адрачэньне беларусаў ад Вільні — на карысьць Літвы, і ў Празе чэскай, каб задэманстраваць „славяна-фільства“ чэскае палітыкі. Але ніхто і нігдзе ня думаў аб запраўдным зрэалізаваньні беларускае незалежнасьці, якая аказалася непатрэбнай нікому з „сільных гэтага сьвету“. І вось на горкім дасьледзе нашы палітычныя эмігранты пераканаліся, што ўсе спадзяваньні на чужацкую дапамогу ў будаваньні незалежнае Беларускае дзяржавы ня маюць ніякае падставы.—Да таго-ж, людзей актыўных, здольных да нейкае творчае працы, страшэнна мучыла іх прымусовая бязьдзейнасьць на чужыне—пад той час, як дома йшла вялічэзная работа, як у абедзьвюх палавінах Беларусі—на Усходзе і на Захадзе—масы ўжо збудзіліся з адвечнага сну і ўзяліся ці то за будаваньне новага жыцьця — ў Радавай Беларусі, ці то за здабываньне належных правоў — у Заходняй Беларусі, аддадзенай заходнімі дэмакратыямі Польскай рэспубліцы... І вось усе, у кім асталося йшчэ хоць трохі сіл і здольнасьці да працы, хто разумеў, што можа нечым быць карысным свайму народу дома,—усе пакінулі безработнае жыцьцё на ласкавым хлебе ў чужынцаў і адзін за адным вярнуліся на Бацькаўшчыну.

З другога боку, ход гістарычных выпадкаў увёў беларускую справу ў зусім новае русло, аб якім ідэолёгі дэмакратычнага ладу ў будучай Беларусі і ня думалі. Ідэю дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі з рук бяссільнае дэмакратыі, што спадзявалася на дапамогу „роднае“, хоць і чужое па нацыянальнасьці, краёвае буржуазіі,—перанялі беларускія сяляне і работнікі, і беларуская дзяржава—хоць і з абмяжаванай самастойнасьцяй—пачала будавацца толькі там, дзе засналася ўлада працоўных. Гэта ў сваей адозьве прызнаў і грам. Ластоўскі,—апошні з тых, што верылі ў дапамогу Літвы і Бэрліну ў будаваньні незалежнае Беларусі...

І сумнае, цяжкое ўражаньне робіць тая ўжо зусім маленечкая астача нашае палітычнае эміграцыі заграніцай, якая ўсё яшчэ прадаўжае ці то шчыра думаць, ці ўдаваць, што думае,—быццам двое ці трое сяброў былае Рады Рэспублікі запраўды „перасідзяць“ і Польшчу, і ўвесь Радавы Саюз, ды прыждуць мамэнту, калі ўрачыста — пад звон царкоўных званоў—прыедуць у Беларусь, як яе „законная ўлада“!... Мінуліся тыя часы, калі „памазанцы божыя“—цары ды каралі—захоплівалі ўладу над народамі на падставе свайго „права валадаць жывымі людзьмі. Дый нашыя прэтэндэнты на ўладу ў Беларусі „памазалі“ хіба самі сябе, бо народ беларускі ані ведае аб іх нічога, ані ня мае нічога супольнага з імі вось ужо дзевяць гадоў... Дый самі яны зусім няздольны ані зразумець імкненьні народныя, ані пазнаць волю народу, за павадыроў якога абабраліся.

Ад вялікага да сьмешнага — толькі адзін крок, кажуць справядліва французы. Крок гэты апошнія нашы эмігранты, што ў Празе чэскай усё яшчэ лічаць сябе „законнай уладай Беларусі“, — здаецца, ужо зрабілі! І зразумець, што—паміма іх—жывы беларускі народ будуе сваё жыцьцё сам—сваімі рукамі, што будаваньне Беларусі адбываецца на ўсіх шляхох і на ўсіх фронтах, што ў кожнай беларускай вёсцы ідзе рупная культурная праца і ўзгадоўваюцца новыя пакаленьні сьвядомых барацьбітаў за сваю волю,—гэтыя людзі ўжо ня ў сілах. Яны адыйшліся далёка ад жыцьця, і жыцьцё адыйшлося ад іх.

„Новая эра“ п. Васілеўскага.

У паўурадавай газэце „Эпока“ былы міністар, стары пэпэсавец, цяпер старшыня слаўнай „камісіі экспэртаў крэсавых спраў“, п. Васілеўскі, зрабіў рад цікаўных „адкрыцьцяў“—аб тэй „новай эры“, якая распачалася ў „меншасьцёвай палітыцы“ новага польскага ўраду ад часу маёвага перавароту марш. Пілсудскага. Ня маючы арыгіналу газэты, падаем гэтыя „рэвэляцыі“ паводле „Белар. Дня“, які з захапленьнем абвяшчае беларусам гэту „новую эру“.

„Той час, калі справамі „крэсаў“ і нацыянальнымі меншасьцямі цікавілася толькі невялічкая частка паступовае польскае інтэлігенцыі, прайшоў. Пасьля маёвага перавароту так сама, як і ў іншых галінах жыцьця, і тут пачынаецца новая эра. Можа зьмены на лепшае і ня йдуць такім шпаркім тэмпам, як гэтага вымагаюць патрэбы дзяржавы, можа ў некаторых галінах і ня відаць яшчэ значнае папраўы, аднак жа бязумоўна справа рушылася з месца“.

Вось што праўда, дык праўда: як толькі справай нац. меншасьцяў, а асабліва — справай беларускай, зацікавіліся, побач, ці ў саюзе з „невялічкай часткай паступовай інтэлігенцыі“, шырокія колы крэсавых абшарнікаў на чале з п. п. Мейштовічам, Незабытоўскім і інш., — дык адразу „справа рушылася з месца“ і адчынілася — „новая эра“. Праўда, некалькі сот беларускіх дзеячоў-барацьбітаў неяк трапілі ў вастрог, — але за тое заблішчэў „Беларускі Дзень“, стала ясна ды цёпла ў „Беларускай Хатцы“ і т. д. і т. д....

„Каб гэта магло стацца, патрэбен быў доўгі час, у які йшла зьмена старое вышэйшае адміністрацыі. Павінны былі прыйсьці і загаспадарыць новыя ваяводы, новыя куратары, якія пачалі (?) ламаць стары закасьцянелы адміністрацыйны апарат, шкодны для справы разьвіцьця добрых адносін нацыянальных меншасьцяў да польскае дзяржавы“.

Ах, як хораша, расчуляюча піша талентнае, чэснае пяро б. пэпэсаўскага міністра п. Васілеўскага! Праўда, сьвятая праўда, пане старшыня Васілеўскі: пасьля перавароту павінны былі прыйсьці новыя ваяводы, новыя куратары, якія б пачалі ламаць...“ і т. д. і т. д... Толькі-ж, вось, неяк дагэтуль яшчэ гэтых „новых“ мы ня бачылі: ў нас асталіся ваяводы ды куратары—старыя, якія і робяць далей тое-ж, што рабілі да перавароту...

„Новыя „памаёвыя“ ваяводы спатыкаліся ўсюды з вялікімі перашкодамі. Перашкоды гэтыя і да самых апошніх часоў ня ўсюды яшчэ зломаны. Дзе-ня-дзе замеры цэнтральнага ўраду спатыкаюцца з сабатажам, калі справа ідзе аб ніжэйшую адміністрацыю (?) Але новы дух цалком запанаваў у колах вышэйшае адміністрацыі, і ў зьвязку з гэтым патроху пачынаюць зьмяняцца настроі“ (?!).

Калі-б навет было запраўды так, як піша на нявінна-белай, нечырванеючай паперы чэснае пяро пэпэсаўца п. Васілеўскага, які атрымлівае належную яго становішчу старшыні „крэсавай камісіі“ пэнсію з рук тэй самай „вышэйшай адміністрацыі“, якую так красамоўна расьпісывае ў яе ўласнай газэце, калі-б усё гэта было навет праўдай, дык і тады шмат-пакутнаму беларускаму насяленьню на „крэсах“ ня было б лягчэй ад таго, што—дзесьці далёка ад яго—„запанаваў цалком новы дух“, калі гэты „дух“ на кожным кроку „спатыкаецца з сабатажам ніжэйшай адміністрацыі“, бліжэйшай да мясцовага насяленьня... „Дух“ — сам па сабе, а адміністрацыя неяк сама па сябе... Праўда —„патроху пачынаюць зьмяняцца настроі“. Праўда, пане б. міністар, — патроху... пачынаюць! Можа, калі і—пачнуць!

„Заспакаеньне патрэбаў крэсавага насяленьня павінна ісьці ў двух напрамках: гаспадарчым і асьветным. Жыхары ўсходніх зямель павінны ведаць, што дзяржава дбае аб іх дабрабыт і ня хоча да іх аднасіцца, як мачыха“... „У гэтым напрамку пайшлі рэформы, як—прысьпяшэньне выкананьня зямельнай рэформы, запэўненьне даступнага крэдыту, падтрымліваньне каапэрацыі, помач у адбудове і засевах і г. д.“.

Аб тым, як „пайшло“ „прысьпяшэньне выкананьня зямельнай рэформы“, мы даведаліся штосьці ў пачатку году ад самага мін. Станевіча, які заявіў, што дзеля выкананьня гэтай рэформы патрэбна будзе выдаць аж... 88 „выканаўчых распараджэньняў“, а дагэтуль—за год ад маёвага перавароту — выдана з гэтых 88 штосьці толькі адно... Аб іншых рэформах чытачы добра ведаюць з беларускіх газэтаў, а яшчэ лепш—з уласнае практыкі...

Далей „Белар. Дзень“ пераказуе сваімі ўжо славамі тое, што „шырока абгаварывае“ п. Васілеўскі ў адносінах да справы асьветных рэформаў новага ўраду на „крэсах“, — аб цыркуляры мін. Бартля, які вымагае ад школьных інспэктароў „шанаваньня мовы і асаблівасьцяў іншых народаў“ і т. д. „Новы дух“, аднак, пануе толькі ў гэтым цыркуляры, але на мясцох ідзе „сабатаж“. Аб праявах гэтага „шанаваньня мовы“ дзяржаўнымі ўрадоўцамі толькі-што пісаў сам „Белар. Дзень“, калі амаль не „забадалі“ яго „тэхнічнага працаўніка“ п. Тулейку...

У канцы п. Васілеўскі, які пэўна-ж ведае мяркаваньні „вышэйшай адміністрацыі“, абяцуе гэткія рэформы: „ўвесь абшар з беларускім насяленьнем будзе выдзелены ў асобны кураторыум; у часе летніх вакацыяў будуць з'арганізаваны курсы для вучыцялёў беларускіх школаў; адна гімназія атрымае правы, і будзе ўстаноўлены інтэрнат для вучняў на 100 асоб“. Дый,—кажа п. старшыня „крэсавай камісіі“, — гэта-ж толькі драбніца з таго, з масы тых „праектаў ды рэформаў“, якія хоча правясьці ўрад“...

Можа й хоча (чаму-ж не хацець?!), але ці можа, ці зможа і ці правядзе, ды як правядзе,—ну, аб гэтым лепш не гаварыць з увагі на істнуючыя ў Польшчы цэнзурныя варункі...

Гандлёвыя скуткі „самагубства Эўропы“.

Параўнаўчая статыстыка заграмічнага гандлю да вайны і пасьля яе ў Эўропе і ў Амэрыцы ды ў іншых краёх найляпей сьведчыць аб страшэнным эканамічным заняпадзе Эўропы, якая да вайны абслугоўвала сваімі таварамі ўвесь сьвет.

Заграмічны гандаль Эўропы (без ССРР) ледзь дайшоў у 1925 г. да 94 прац.; Паўночная Амэрыка давяла свой замежны гандаль да 137 працэнтаў даваеннага; Сярэдняя Амэрыка—да 128 прац., Азія (ня ўлічаючы ССРР)—да 136 прац.

Лічбы вывазу — яшчэ больш паказальныя. Вываз Эўропы (без ССРР) у 1924 г. не перавысіў 86 прац., а ў 1925 г.—89 прац. даваеннага; у іншых пералічаных вышэй частках сьвету вываз узрос да 128—147 проц. даваеннага. Калі да вайны доля Эўропы ў сусьветным вывазе была больш паловы—51 прац., дык у 1925 г. яна дайшла толькі да 44 прац. Коштам Эўропы значна павялічыліся долі Паўночнай Амэрыкі, Азіі і Аўстраліі. Асабліва павысілі свой вываз Амэр. Штаты, Канада, Індыя, Японія і Кітай.

Асаблівы спадак экспорту (вывазу) з эўрапэйскіх краёў прыпадае на Англію і Нямеччыну, якія да вайны мелі найвялікшую долю ў сусьветным вывазе з усіх краёў. Што Нямеччына страціла каля паловы свайго вывазу, у гэтым нічога дзіўнага, бо-ж яе білі ды руйнавалі ў часе вайны і пасьля яшчэ больш усе, хто толькі хацеў. Дый, ня гледзючы на гэта, вываз Нямеччыны ўсьцяж расьце. Палажэньне Англіі—значна горшае: з вайны яна скарыстала, як ніводная з дзяржаваў, а яе вываз усьцяж спадае ды спадае...

Страшэнна небясьпечнае зьявішча, амаль не агульнае ў Эўропе, гэта — пагоршаньне „тарговага балянсу“. Асабліва небясьпечнае палажэньне ў гэтым сэньсе ізноў мае Англія, у якой вываз ня толькі не перавышае ўвозу, але штогодна гэтая некарысная перавага ўвозу над вывазам усьцяж расьце, дый яшчэ так катастрафічна, што, напрыклад, у 1922 г. вываз толькі на 82 прац. пакрываў увоз, а ў 1925 г. — ужо толькі на 68 прац. А далей, як мы ведаем, прышлі такія падзеі, як забастоўка вуглякопаў у 1926 г., пасьля—кітайскі таргова байкот, пасьля — ваенная авантура, разгром англійскіх маемасьцяў ды канцэсіяў у Кітаі і г. д. Усё гэта павінна было страшэнна адбіцца на таргова́м ды расчотным балянсе Англіі.

Дык ясна, чаму Англія так асабліва клапоціцца аб заваяваньні новых рынкаў дзеля збыту сваіх тавараў у Эўропе.

Пагроза адстаўкі Штрэзэмана.

Нямецкія газэты паведамляюць, быццам нямецкі пасол у Парыжу, дамагаючыся ад францускага ўраду прысьпяшэньня скасаваньня ці радыкальнага зьмяншэньня акупацыі Надрэніі, выразна казаў Брыяну, што няўступлівасьць Францыі пакажа Нямеччыне ды ўсяму сьвету усю бязвартнасьць „лёкарнскай палітыкі“ Штрэзэмана. У выніку гэтага Штрэзэману астанецца толькі—пад націскам абуранай народнай апініі ў Нямеччыне—прызнаць сваю абмылку ды выйсьці ў адстаўку...

Трэба ведаць, якую вялікую папулярнасьць, як прадстаўнік мірнай палітыкі паразуменьня, мае Штрэзэман у Эўропе, а асабліва ў Амэрыцы, каб ацаніць сілу таго ўдару, які хоча нанясьці нямецкі ўрад Францыі... Пэўна ж, першым вынікам гэтага будзе зачыненьне амэрыканскае каліты для Францыі.

Ня можа быць сумліву, што адстаўка Штрэзэмана адбілася-б і на амэрыканскім крэдыце для Польшчы... Ня так даўно француская прэса напомніла аб тым, што акупацыя левага берагу Рэйну прадбачана Вэрсальскім Трактатам ня толькі дзеля таго, каб загарантаваць сплату Нямеччынай ваеннай кантрыбуцыі ці „адшкадаваньняў“ на карысьць пераможцаў, але яшчэ і дзеля таго, каб даць магчымасьць новапаўстаўшым—коштам нямецкай тэрыторыі—дзяржавам палітычна і гаспадарча ўкрапіцца, дый каб наагул даць час „устабілізавацца“ Новай Эўропе. Дзеля таго аканчальны тэрмін, да якога саюзьнікі маюць права трымаць акупацыю, назначаны аж на 1935 год... Гэткім чынам ясна, што цяпер, пасьля прыняцьця Нямеч-

чынай „пляну Доуса“, загарантаваўшага выплату адшкадаваньняў, ды пасьля „Лёкарно“, якое забясьпечыла нятыкальнасьць францускай граніцы, увесь сэнс утрыманьня акупацыі лініі Рэйну зводзіцца толькі выключна да загарантаваньня нятыкальнасьці ўсходняй, а перадусім — польска нямецкіх граніц. І вось, толькі што адзін з уплывовых францускіх публіцыстаў выразна запрапанаваў скасаваць зусім, ці зьменшыць радыкальна акупацыю Надрэніі—ў замену за выразную гарантыю з боку Нямеччыны польскай граніцы, інакш кажучы—за пашырэньне „Лёкарнскай умовы“ і на ўсход.

Як ведама, ня толькі правая большасьць ураду, ня толькі ўся нямецкая прэса, але і найбольш асьцярожны й дыпляматычны Штрэзэман рашуча й выразна адмовіліся ад прызнаньня нямецка-польскіх граніцаў... А толькі нямецкі пасол, пагражаючы адстаўкай Штрэзэмана, рашуча патрэбаваў у Парыжу зьліквідаваньня акупацыі — **без усялякіх дадатковых варункаў**, заявіўшы, што нямецкі ўрад пашле Францыі ў чэрвені, калі скончыцца бурэньне нямецкіх крэпасьцяў на пагранічны з Польшчай, афіцыяльную ноту ў справе акупацыі...

Як бачым, Нямеччына зусім ня зьбіраецца чакаць „палітычнай кансалідацыі новастворанных дзяржаваў“ — аж да 1935 году!

Гаспадарчая Канфэрэнцыя у Жэнэве.

Нямецкія дэлегаты дамагаюцца скасаваньня „пляну Доуса“.

10 траўня ўсё ранічнае паседжаньне Канфэрэнцыі занялі прамовы нямецкай дэлегацыі, якія ўсё даводзілі канешнасьці — дзеля аздараўленьня сусьветнай гаспадаркі ды зьмяншэньня безрабоцьця ў Нямеччыне— скасаваць „плян Доуса“, які налажыў на Нямеччыну непадсільныя для яе цяжары адшкадаваньняў.

Радавы дэлегат у Жэнэве аб польска-расейскіх перагаворах

Сэкрэтар радавай дэлегацыі ў Жэнэве Штэйн заявіў у гутарцы з карэспандэнтам польскіх газэт, што галоўнай перашкодай дзеля заключэньня польска-радавай гандлёвай умовы зьяўляюцца палітычныя адносіны між абыдвума краямі. Ня можа быць гаспадарчага супрацоўніцтва без ўрэгуляваньня палітычных стасункаў. У Маскве ідуць цяпер перагаворы ў справе ўмовы аб узаемных гарантыях прыязьні. Але гэтыя перагаворы ўсё неяк зацягіваюцца дый—ня з віны радаў...

Нямецкая прэса аб радавай дэлегацыі ў Жэнэве.

Нямецкія газэты пішуць, што выступленьне радавых дэлегатаў у Жэнэве зрабіла сільнае ўражаньне на ўчасьнікаў Канфэрэнцыі. Калі Сакольнікаў скончыў сваю гадзінную прамову, многія з дэлегатаў кляскалі яму, у тым ліку—англійскія. Радавыя дэлегаты,—кажуць газэты, — выявілі шмат лоўкасьці ў сваіх выступленьнях у „парляманьце сусьветнага капіталізму“. Масква выразіла сваю гатоўнасьць працаваць побач з сусьветным капіталізмам з такой яснасьцю, як не рабіла гэтага яшчэ ніколі раней. Апалітычны характар Канфэрэнцыі дае ей з свайго боку магчымасьць, міма ўсялякіх палітычных разыходжаньняў, прызнаць усю неабходнасьць супрацоўніцтва СССР з капіталістычнымі краямі сьвету“.

Карэспанд. „Кур. Варш.“ піша з Бэрліну, што нямецкая рэспубліканская прэса вельмі прыхільна адгукнулася на прамовы павадыроў радавай дэлегацыі на Канфэрэнцыі ў Жэнэве.

Жэнэўскія карэспандэнты нямецкіх газэт пішуць навет, быццам з прамоваў гэтых было відаць, што Рады ня толькі імкнуцца да гаспадарчага паразуменьня з Эўропай, але готовы ўвайсьці ў склад Лігі Народаў... Нямецкая прэса наагул прыпісывае ўчасьцю Радаў у канфэрэнцыі вялікае значэньне. Адна з нойвялікшых газэт навет называе прамову старшыні Сакольнікава „гістарычным мамэнтам“. Трэба думаць, што запраўды-ж Нямеччына вельмі-б жадала ўваходу СССР у Лігу, каб мець там сабе сільнага саюзьніка...

Барацьба ў Кітаі.

Чанг-Тсо-Лін рыхтуецца да паходу на Шанхай.

Войскі Чанг-Тсо-Ліна быццам рыхтуюцца да вялікага паходу на Шанхай. Адна армія яго мае ісьці на Нанкін, да якога ўжо падыйшла вельмі блізка; другая стаіць ужо над местам Кінг Кіянг — у 150 кілямэтраў ад Шанхаю...

Ханькоў у небясьпецы.

Лёндынскія крыніцы даносяць, быццам Ханькоў дажывае апошнія дні — перад заняцьцем места Чанг-Тсо Лінам.

Цікаўна, — што ж робіць Чан-Кай-Шэк, які маніцца ўзяць навет Пэкін?!...

Толькі адзін Мусоліні падтрымлівае Англію ў Кітайскай авантуры.

Англійская акцыя, скіраваная да стварэньня супольнага фронту вялікіх дзяржаваў дзеля інтэрвэнцыі ў Кітаі, — правалілася аканчальна. Сьпярша адмовілася рашуча Амэрыка, пасьля Японія, вось толькі што і Францыя. Францыя заявіла, што пасьля адмовы Японіі яна ня можа падтрымоўваць англійскія пляны аружнага паходу ў Кітаі

Гэткім чынам Англія асталася толькі адна — з Італіяй. Але гэта не перашкаджае ей рыхтавацца да акцыі — на сваю руку. Пасьля разьбіцьця Чан Кай-Шэкам нацыянальнага руху ў Кітаі Англія можа адважыцца на тое, аб чым ужо навет думаць пакінула, калі яе білі кантонскія арміі на кожным кроку. Толькі дарэмна Англія думае, што навет у выпадку ўдачы яе ваеннай авантуры ў Кітаі рэшта дзяржаваў дазволіць ей выкарыстаць усе плады яе пасьпеху — коштам Кітаю...

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Паліцэйскае „баданьне“.

„Роботнік“ піша аб тым, як у Беластоцкім павеце, на пастарунку у Долістове паліцыянты каталі двух работнікаў з фальварку Мікіцін, Марцыняка і Дэца, якіх падазравалі ў кражы каровы. Пасьля арышту іх, у 12 гадз. у ночы, пачалося гэткае іх „баданьне“. Даслоўна перакладаем з „Роботніка“:

„Марцыняку і Дэцу скавалі рукі і прывязалі іх да ног так, што рукі былі ніжэй кален. Тады між рукамі і каленамі ўсадзілі шаблю ды пачалі страшэнна біць іх зялезным прутам па падошвах ног. Білі іх гэткім чынам чатыры разы. Калі і пасьля гэтага Марцыняк і Дэц ня прызналіся да закінутага ім учынку, тады паліцыя палажыла іх на 2 крэслы так, што галовы іх зьвісалі, пасьля ўліла ім у рот 2 бутэлькі вады, зьмешанай з воцатам і нафтай.. Гэткія катаваньні трывалі ад 12 да 5 гадз. раніцы, аднак-жа не далі ніякага рэзультату: катаваныя ня прызналіся да віны“.

Газэта дадае, што — „гэткія факты на пастарунку ў Долістове досьць частыя“...

Цікаўнае назначэньне.

Газэты даносяць, што ўрад мае назначыць палкоўніка запасу п. Пестжыньскага, старшага вэтэрынара ў Калішу, за дырэктара Дэпартаманту Здароўя ў мін. унутраных спраў.

У гэтым цікаўна ня толькі яшчэ новая праява мілітарызацыі міністэрства, але і тая мо' крыху больш, як камічная рэч, што на становішча галоўнага апякуна чалавечага здароўя ў Польшчы ўрад ставіць асобу, спэцыяльнасьцю якой зьяўляецца ахоўваньне здароўя хатняе скаціны... Здаецца, штосьці раз ужо гэткі быдлячы доктар быў навет прэм'ерам: гэта—праф. вэтэрынарыі п. Новак. Але той быў ярынамся прафэсарам...

Ізноў „рыцарскі мардабой“ ў Варшаве.

Мардабойныя расправы ня спыняюцца ў Варшаве Апошнім выпадкам зьявілася па біцьцё ведамым „лявіцоўцам“-пілсудчыкам Мэдардам Довнаровічам яшчэ больш ведамага эндэцкага публіцыста-антыпілсудчыка, Адольфа Новачыньскага. Гэты апошні напісаў нешта ядавітае аб п. Довнаровічу, дык той, сустрэўшы яго ў тэатры, кінуўся да эндэцкага пісакі і даў яму па твару.

Эндэцкія газэты пішуць, што п. Новачыньскі ў адказ на гэта разам з братам сваім пабіў п. Довнаровіча палкай.

Заграніцай.

Нямецкі афіцыёз — у справе пазыкі для Польшчы.

Нямецкая газэта „Штодзенны Агляд“, вельмі блізкая да Штрэзэмана, піша, што амэрыканская пазыка для Польшчы — вельмі няпэўная, пакуль польскі ўрад не ўрэгулюе справы таргова палітычнага паразуменьня з Нямеччынай. Дык Польшча павінна пасьпяшыць з тымі ўступкамі на карысьць Нямеччыны, ад якіх нямецкі ўрад узалежняе ўзнаўленьне перагавораў...

„Кур. Варш.“ падчырківае, што гэткія рэчы піша афіцыёз нямецкага міністра заграгранічных спраў..

Праект новай літоўскай канстытуцыі.

Рада міністраў апрацавала праект новай літоўскай канстытуцыі. Праект прадбачыць зьмяншэньне лічбы паслоў напалову. Сойм мае склікацца на 5 гадоў. Штогодна Сойм будзе мець толькі дзьве сэсіі—асеньнюю ды вясеньнюю, з якіх кожная будзе цягнуцца ня больш, як два месяцы. Прэзыдэнт мае выбірацца ўсенародна — на 7 гадоў. Калі Прэзыдэнт хворы, дык яго заступае не старшыня Сойму, як цяпер, але—прэм'ер. У часе, калі Сойм не працуе, урад мае права выдаваць законы шляхам дэкрэтаў...

Францускія лявіцоўцы проці Літвы.

Газэта „Новая Эра“ дае рэзкую адправу літоўскаму ўраду—за яго „замах“ на Віленшчыну, якую Рада Паслоў „аканчальна аддала Польшчы, усталіўшы назаўсёды граніцы—як Літвы, так сама і Польшчы. Усялякія спробы падняць ізноў вырашаную справу могуць толькі выклікаць новыя канфлікты, пагражаючы міру. Нота паслоў Англіі, Францыі і Італіі паклікала да парадку прэм. Вальдэмараса, якому астаецца толькі зразумець усю вагу ды павагу гэтай перасьцярогі.

Дагэтуль, пакуль літоўскія фашысты не папсавалі добрых адносінаў Літвы з яе магутным усходнім суседам, гэтак не дазвалялі сабе зварачацца да Літвы—ані паны „амбасадоры“, ані хто іншы.

Паварот Латвійскае палітыкі.

Паварот латвійскае палітыкі ў кірунку да паразуменьня з СССР мае сваей падставаё новы кірунак, які выяўляецца ў ідэалёгіі ўрадавае сац.-дэм. партыі.

Адзін з лідэраў латвійскай сацыял-дэмакратычнай партыі, гр. Бушэвіц, выпусьціў у сакавіку вельмі цікавую кніжку, у якой даводзіць, што Латвія павінна шукаць сабе сяброў не на захадзе, у імпэрыялістычнай Англіі і Францыі, а на Усходзе, у СССР, з якім Латвія мела і заўсёды будзе мець шмат супольных інтарэсаў.

Пры гэтым г. ё. Бушэвіц успамінае, што партыя латвійскіх сацыял-дэмакратаў ніколі да 1918 году ня імкнулася да незалежнае Латвійскае дзяржаўнасьці, асабліва-ж у выглядзе буржуазнае рэспублікі, якою цяперака Латвія сталася.

Фэдэрацыя з СССР здаецца Бушэвіцу вельмі магчымым выхадам для Латвіі з сучаснага цяжкага стану.

Некалькі месяцаў таму назад і другі, вельмі выдатны лідэр латвійскіх сацыял-дэмакратаў. гр. Мэндэрс, таксама пісаў аб фэдэрацыі з СССР.

Чычэрын варачаецца ў Маскву.

Нямецкія газэты паведамляюць, што Чычэрын з Ніццы, дзе скончыў лячэньне, едзе праз Парыж, не затрымаўшыся там, — проста ў Маскву.

Нямецкія работнікі і тэхнікі ў СССР.

„Усх. Аген.“ паведамляе, што ў Маскву маюць прыбыць з Нямеччыны новыя партыі нямецкіх работнікаў і тэхнікаў-спэцыялістаў пераважна дзеля ваеннай прамысловасьці. Быццам усяго ў СССР нямецкіх работнікаў, тэхнікаў ды майстроў—аж 100 тысяч (?), дый пераважна—у ваеннай прамысловасьці. Толькі на адным Пуцілаўскім заводзе працуе немцаў 3.000 чалавек. „Цікаўна,—дадае „Усх. Агенцтва“,—„што гэтыя работнікі атрымліваюць пэнсіі з нямецкага ваеннага міністэрства“ (?!).

Ці—ўзнаўленьне перагавораў з Англіяй?

З Масквы пішуць, быццам радавы паўнамоцнік у Лёндане Розэнгольц, мае зрабіць візыту Чэмбэрлену, каб перадаць яму дамаганьні СССР. З свайго боку радавы ўрад высоўвае 2 галоўныя дамаганьні: утварэньне ў Лёндане заграўднага пасольства і — ўрэгуляваньне справы англійскіх крэдытаў для СССР.

Француская пракуратура цягне ў суд 4 паслоў камуністаў.

Француская пракуратура зьвярнулася да ўраду аб дазвол прыцягнуць да адказнасьці 4 камуністычных паслоў за іх агітацыю сярод войска.

Новы націск нямецкага ўраду на Францыю

10 га траўня нямецкі паўнамоцнік у Парыжу Рыд меў ізноў доўгую размову з Брыянам, — дый перад самым паседжаньнем Рады Міністраў. Нямецкая прэса піша, што размова йшла аб палючай для немцаў справе скасаваньня акупацыі. Француская прэса піша, што справа ня мае памысных для немцаў відаў. Бо ж калі б навет Брыян і згадзіўся — дзеля ўратаваньня „духа Лёкарно“,

Відзежа у вастрозе.

Пасьвячаецца ўсім вязьням беларусам.

1.

Прабіла дванаццаць, яшчэ я ня спаў
І ў цяжкай задуме у даль пазіраў
Праз краты: на неба, дзе зоры зігцелі
Бы сьвечкі у цемры, яны так гарэлі.
І думкі аб волі цішком усплылі,
Аб доме далёкім, аб роднай зямлі,
Аб сёстрах і браце, што цяжка працуюць
І, маюць хоць волю, бядуюць, гаруюць.
„О, воля, ты, воля, ты—шчасьцем жыцьця!
Чаго-ж там у брата і гора й бяда?
О, воля, ты, воля, ты—скарбам душы, —
Чаго-ж там сястрыцы льюць сьлёзы сваі?“
І сэрца балюча маё зашчымела,
І ў жылах, здавалася, кроў схаладнела,
З вачэй маіх сьлёзы, як боб, пацяклі —
Бязмоцтва і назласьць бурлілі ў душы.
Ізноў я праз краты у даль пазіраю
І дзіўнае дзіва ужо агдядаю.
У цэлі панурай, прад самым вакном
Мой дзедка небожчык стаіць тут жыўцом.
З-пад броваў навісшых, бы скалы над морам,
Дзьве зрэнкі бліщчэлі, гарэлі, як зоры,
І срыбрам бліскучым яго валасы
Фаліста віліся наўкол галавы;
Вусы з барадою ягонай зрасьліся.
Прыгожа ў павіткі яны папляліся.
Мужыцкай сярмягі, бялюткай, як сьнег,
Прыгожыя фалды спускаліся з плеч.
І ён прад сабою руку прасьцірае
І зычна і цьвёрда той дзед прамаўляе:
„Унук мой гаротны, мужык ты—гляджу;
Ня плач і паслухай, што я раскажу:
Я—дух з таго сьвету і послан дзядамі
Зірнуць, што зрабілась цяперака з вамі.
Я Белае Русі цяпер не пазнаў,
Ці-ж гэтага з дзедаў хто нашых чакаў?“

2.

„Паслухай, я помню даўнейшы той час,
Пярун калі грозны быў богам у нас.
На Белай Русі тады на бязьмежнай
Лясы, або пушчы расьлі векавечны.
Было дзе балота—чароты расьлі,
І чэрці касматы там толькі жылі.
А ў поце крывавым мы ўсе працавалі
І пушчы і нетры сякерай зсякалі,
Калі-ж засталіся па нетрах карчы —
Гарбом дасталі іх з цьвёрдай зямлі.
І так мы рабілі абшары палёў
З лясоў пагудасных і з цёмных бароў.
А ў зыбкіх балотах канавы капалі,
І іх у зялёны лугі абярталі.
І мы працавалі, як тыя рабы,
І толькі адныя ў нас думкі былі:
„Палёў тых разлогі, што мы выкарчуем,
Унукам-патомкам на векі даруем.
На іх каб унукі спакойна жылі,
Заўсёды каб мелі кус хлеба яны;
За хлеб каб іх дзеці каму ня служылі,
А дзедава поле заўсёды рабілі.
Таксама й абшары зялёных лугоў,
Каб сена хапала для коней, кароў“.
Сягоньня-ж я чую—патомкі-унукі,
Дзядоў праклінаюць праз сьлёзы і мукі,
Сягоньня-ж я бачу унукаў дзяцей,
Як плачуць галосяць над доляй сваей...
Палёў тых разлогі, што мы рыхтавалі,
Чужынцы нязваны сабе разабралі,
А нашым унукам палоскі-шнуркі
За плату вяліку для зьдзекаў далі,
І цісяуць падаткі, аж, нат' з кураняці,
З акна, што анучай трэ' ўжо затыкаці.
За грош той крывавы чужынцы паны
Гуляюць у шале на нашай зямлі“...

3.

„Паслухай, паслухай! Мы замкі стаўлялі,
Палацы, прыгожы дамы будавалі
І гэтая праца ня лёгкай была —
Здароўя і поту, ой, многа ўзяла,
Калецтвам і сьмерцю сябе пакрывала,
Будоўлі крывёю, сьлязой абмывала,
А мы працавалі, як тыя рабы,
І толькі адныя ў нас думкі былі:
„З каменьняў будоўлі, што мы пабудуем,
Унукам-патомкам на векі даруем,
Каб нашыя ўнукі жылі ў іх людзьмі,
Прыгожа і чыста, бяз гора й бяды.
А замкі й палацы, як мы мяркавалі,
Для іх няхай будуць на школы, шпіталі...
Каб дзетак маленькіх вучыць дзе было,
Каб роднае слова прыгожа цьвіло,
Каб старцы, калекі і сіраты, ўдовы
Прытулак бы мелі і догляд гатовы“.
Сягоньня-ж я бачу, аж страх мне казаць,
У замках, палацах паны ўсё сядзяць,
А нашыя ўнукі, хоць цяжка працуюць,
У нейкіх халупах таўпяцца, гаруюць.
Зайшоў я у хату, аж сьлёзы пашлі —
Там гэтулькі смроду, там толькі бяды!
Крывавыя грошы, паны што зьбіраюць,
У замках, палацах яны прапіваюць,
І п'янай музыкай сябе весяляць
І з паннамі гадку распусту тварацьь...
На школы-ж, прытулкі для дзетак мужыцкіх
Ні грошай, ні мейсца у краю вялікім.
Зьмягчыць каб бядоту ў жыцьці мужыка —
Панам тым падумаць нат' часу няма....

4.

„Паслухай, унуча! Мы ў бітвах крывавых
Ня мала здабылі вялікае славы:
Мы ўсім памагалі, хто праўды шукаў,
Пра нашыя дзіды гром славы лятаў.
Калі-ж мы ва ўладу чужынцам папалі —
Пакорай дзіцячай мы сьвет здзівавалі.
І ў цяжкай няволі, бяз крыку й сьлязы,
Мы часьці давалі ад поту й крыві.
І нашым-жа коштам зямля спавілася
Дарогай зялезнай, сашой апляялася,
І нашай-жа працай зялезны масты
І фабрыкі ўсюды стаяць на зямлі.
І мы пастаўлялі усе тэлефоны,
Музэі, ціятры для штукаў шалёных....
І ўсё працавалі, як тыя рабы,
І толькі адныя ў нас думкі былі:
„Усё, што мы зробім на нашай зямліцы,
Патомкам хай будзе для большае чэсьці,
Каб нашыя ўнукі ў вольным жыцьці
Культуру і славу, каб мелі сваі“.
Сягоньня-ж я бачу на Белае Русі
Культуру другую ўшчапляюць прымусам.
Сягоньня-ж усюды прышлося мне чуць
Унука ня йначай, як хамам завуць
І навет ня лічаць яго чалавекам.
„Ен“, кажуць, „застаўся скацінай век-векам“,
„Ен“, кажуць, „ня можа сабой кіраваць.
Яго яшчэ трэба пад бічам трымаць“.

5.

„Ня плач жа, унуча, над доляй сваёю,
Ня мый свае вочы ты мутнай сьлязою.
Ты бачыў няпраўду і крыўду усю,
Ты ўсё тое бачыў, што тутака чуў...
І сьмела і чэсна свайму ты народу
Да шчасьця і волі паказваў дарогу,
Да працы свабоднай, бяз гнёту паноў,
На нашай зямельцы ты клікаў братоў.
Ты роднага слова нігдзе ня цурайся —
Дарогі ты праўднай усюды трымайся.
Дык „дзякуй“ вялікі табе ад дзядоў,
А гонар пачэсны ад сёстраў, братоў!
Ня плач-жа, унуча, на гэтай пасьцелі
Ад сьлёзаў каб вочы твае не зацьмелі,
Бо хутка надыйдзе час радасны той,
Калі ты народу зноў станеш слугой.
Ты йзноў праважатым павінен зрабіцца —
Аж покі у цемры агонь замігціцца,
Бо так вымагаюць з магілаў дзяды,
Бо гэтак жадаюць і сёстры й браты!
Унук мой, ня дайся спакусе адчаю,
Бо шчасьце ўжо блізка ад нашага краю!
І помні-ж, унуча, што я расказаў“.....
І тут-жа ў цэлі мой дзедка прапаў.

1./IV. 1927 г. **Улад. Ініцкі.**

ды мін. Штрэзэмана—зрабіць новыя ўступкі Нямеччыне, дык проці гэтага выступілі-б амаль ня ўсе іншыя міністры габінэту.

Запраўды-ж, нейкае „лёкарно“ паміж Брыянам і Штрэзэманам—асабіста...

Трэцяя візыта нямецкага пасла ў Брыяна.

11 га траўня нямецкі паўнамоцнік у Парыжу зрабіў трэцюю візыту Брыяну, у часе якой ізноў прасіў ясна высьветліць адносіны францускага ўраду да справы зьмяншэньня акупацыйных войск. Бо ад гэтага залежыць становішча Штрэзэмана.

Англійскі ўрад проці зьмяншэньня акупацыйных войск у Нямеччыне.

Ваенны міністэр Англіі заявіў у парляманьце, што далейшае зьмяншэньне акупацыйных войск у Надрэніі, якіх Англія трымае там 7.200, у бліжэйшым часе немагчыма.

Падрыхтоўка да вайны.

Мусоліні вядзе буйную ігру, падгатоўваючы яўна замах на Балканах. Вэнгерская работніцкая прэса публікуе трывожныя весткі аб тым, што—у дадатку да „трактату прыязьні“, Мусоліні мае заключыць з Вэнгрыяй „ваенную канвэнцыю“ (ўмову). У зьвязку з гэтым у Рым маюць прыехаць 2 вэнгерскія генаралы, якія пачнуць перагаворы аб гэтым з італьянскім генаральным штабам.

Арышты „штальгэльмаўцаў“.

У сувязі з дэманстрацыямі ў часе зьезду „Штальгэльму“ ў Бэрліне паліцыя заарыштавала 833 асобы, з якіх большасьць была зараз-жа пасьля зьезду выпушчана на волю. Толькі 109 асоб затрыманы дзеля распачатага сьледзтва.

Водгукі нямецкага „сталёвага зьезду“.

На сабраньні Англійска-Францускага Таварыства ў Бірмінгэме адзін з найвыдатнейшых павадыроў англійскіх кансэрватараў, сябра ўраду, вялікі прыяцель Францыі, лёрд Дэрбі, сказаў прамову, яўна выкліканую зьездам „Сталёвага Шалому“ ў Бэрліне.

Аратэр заявіў, што з гэтага зьезду відаць, што „ваенныя настроі ў Эўропе зусім не зьліквідаваны“. Дык папросту неабходна даць паняць усім тым, хто лятуціць аб вайне, што яны самі заплацяць усе кошты ды пасьледзтва распачатай ваеннай авантуры. Хай перадусім ведаюць, што Англія стане на бок кожнага, проці каго будзе зроблены напад, дый што прыязьнь Англіі да Францыі—непахільная“...

„Англія стане на бок кожнай дзяржавы, на якую будзе зроблены напад“,—апрача тых выпадкаў, калі напад падрыхтаваны з ведама дый з дапамогай самае Англіі...

Англія просіць Амэрыку перагляддзець справу даўгоў.

Дагэтуль Англія акуратна плаціла Амэрыцы свае ваенныя даўгі. Англія навет першая ўрэгулявала гэтую справу, каб з свайго боку мець маральнае права спаганяць ваенныя даўгі з сваіх даўжнікоў.

Аднак-жа цяпер, калі Англіі робіцца ўсё цяжэй, калі яе гаспадарчая раўнавага трашчыць, калі ў яе бюджэце дэфіцыту некалькі сот мільёнаў даляраў, калі датаго ж трэба выдаваць вялізарныя сумы на ваенную авантуру ў Кітаі,—Англія ня вытрымала ды зьвярнулася да Амэрыкі прасіць „пардону“. Англійскі ўрад просіць, каб Амэрыка згадзілася на перагляд таго пляну сплаты даўгоў, які дзее цяпер, бо ён — зацяжкі для Англіі. Зачэпкай для дамаганьня перагляду зьяўляецца тое, што для Францыі, Італіі і інш. сваіх даўжнікоў Амэрыка згадзілася на шмат лягчэйшыя варункі сплаты, як для Англіі, ня гледзячы на тое, што Англія аказалася найбольш сумленнай з іх усіх.

Зьезд дэлегатаў англійскіх калёніяў.

10 траўня распачаўся ў Лёндане зьезд дэлегатаў усіх англійскіх калёніяў і „мандатных зямель“. На зьезьдзе маюць быць абгавораны справы гаспадарчыя, камунікацыйныя тэхнічныя, датычучыя калёніяў. На зьезд прыбылі прадстаўнікі 24 каляніяльных зямель Англіі.

Стыхійная катастрофа ў Амэрыцы.

Яшчэ ня спалі воды вялізарнае ракі ў Амэрыцы, Місісіпі, якая заліла гэлы рад мястаў у ваколіцах Новага Орлеану, пакінуўшы бяз даху над галавой звыш 200.000 душ, — а вось ізноў наказуюць аб стыхійнай катастрофе, якая сталася ў сярэдня-ўсходняй і паўдзённа-ўсходняй часткай Паўночнае Амэрыкі. Тамака прыйшоў нябывалы па сіле гураган. Ёсьць больш 200 забітых, тысячы раненых. Матэрыяльныя страты дасягаюць многа мільёнаў даляраў.

Як Амэрыка гаспадаруе ў Нікарагуа.

Адмірал Лятымэр, начальнік ваенных сілаў Амэрыканскіх Штатаў, якія фактычна акупавалі Нікарагуа, змусіў да здачы і разбраеньня ўсю армію лібэральнага прэзыдэнта Сакассы. Гэты павадыр паўстанцаў згадзіўся—пад ботам адмірала—на тое, што да новых выбараў у 1928 г. будзе правіць краем прэзыдэнт Дыяз, павадыр праціўнай партыі кансэрватараў, які прадаў фактычна незалежнасьць Рэспублікі амэрыканскаму ўраду.

Але найцікаўней, што ўжо пасьля гэтага поўнага разгрому паўстаньня адмірал Лятымэр патрэбаваў ад свайго ўраду—прысылкі новых ваенных сілаў. Ясна, што Амэрыка зьбіраецца папросту захапіць патрэбны для яе край!

АРГЭНТЫНА.*)

Аграрны лад. Спосабы эксплёатацыі. Земляўласьнікі, арандатары, працэнтнікі і батракі. Новы плян калянізацыі. Ініцыятыва ангельскіх чыгуначных таварыстваў ў рэспубліцы Аргэнтыне.

Рэспубліка Аргэнтына вельмі бедная ў сэньсе развою індустрыяльнай прамысловасьці за выняткам здабываньня газы, якое надта пашырана, але не настолькі, каб канкураваць на сусьветным рынку. Усё багацьце краю апіраецца на земляробства і жывёлаводзтва. Сотні мільёнаў тоннаў (тонна 61 пуд.) збожжа вывозіцца за граніцу што год, галоўным чынам пшаніцы, кукурузы і льну; а авёс, ячмень і канюшына—нэ маюць вялікага значэньня. Вывозяць таксама мільёнамі тоннаў застужанага мяса, тлушчу, скуры і шарсьціньня. Вось гэта ўсё і ёсьць аснаўным багацьцем Аргэнтыны.

Эўрапэйскі жыхар, калі ён будзе глядзець на багацьце краю з пункту гледжаньня эканоміі—падумае, што насельніцтва жыве ў поўным задаволеньні і дабрабыце, а асабліва калі гляне на каляніста, што гаспадарыць на зямлі. Але вельмі памыліцца ён, калі так падумае, бо ня знае варункаў мясцовага жыцьця, парадкаў, звычаяў, бо ня знае ён таксама земляробскіх законаў краю, на аснове якіх робяцца інтарэсы паміж земляўласьнікамі і калёністамі. Земляробскі закон тут на столькі заблутаны, што навет юрыдычныя кодэксы ня могуць даць каляністу забясьпечаньня. Усе неабмежаныя правы застаюцца за земляўласьнікам, пасрэднікам і эканомам. Гэта адзін тып у трох відах: Бог, цар і закон.

Як доказ, падамо тут характэрны прыпадак. У правінцыі Entre Ryos адзін арэндатар арэндаваў зямлю ў абшарніка на варунках 25 проц., гэта знача, што на кожныя сто мяшкоў збожжа 25 ішло на карысьць абшарніка. Але сам арандатар зямлі не абрабляў, а здаў яе ў арэнду 20-ём калянiстам. А калі апошнія сабралі з поля збожжа і гатаваліся да малацьбы—атрымалася вельмі няпрыемная гісторыя: абшарнік законным парадкам налажыў арышт на ўсё збожжа і змусіў калёністаў пакінуць яго зямлю.

Як відзяць з гэтага чытачы—спэкулянт і эксплёататар застаўся з грашыма і бяз ніякай адказнасьці, а каляністы, якія ўлажылі капітал і год цэлы працы засталіся бяз хлеба і без страхі. І дарма яны спадзяюцца на права, бо магутная аргэнтынская багіня справядлівасьці Тэміс сьляпая: яе вагі падтрымоўваюць мацнейшага, а меч яе напраўлены заўсёды ў бок слабейшага. Падобных фактаў можна было-б прывесьці і больш, але гэта і непатрэбна, бо такія факты тут паўтараюцца на кожным кроку і носяць ужо агульны характар.

Аседлых малых земляўласьнікаў падобных да эўрапэйскіх сялян тут няма, няма таксама ні вёсак ні хутароў, а проста ляжыць перад табой неабняты стэп сумны, манатонны, толькі дзе ня дзе відаць вылепленыя з гразьзі халупы. Выгляд такой халупы надта мізэрны: нізенькая, брудная, сумная, няма каля яе ні куста ні дрэўца, а гэта таму, што халупа гэта часовая, як часовы і яе жыхар

Есьць вялікія і малыя пасёлкі, але толькі абапал чыгункі. Жывуць у іх розныя гандляры і спэкулянты, а каляністы жывуць глыбака ў стэпу.

Між калянiстамі ёсьць і ўласьнікі, але іх надта мала, набярэцца можа працэнтаў 10—12. Амаль што ўся зямля ў руках вялікіх абшарнікаў, розных кампаніяў і прыватных банкаў, але ніхто з іх гаспадаркай не займаецца. Яны здаюць зямлю сваю, або ў арэнду калянiстам, або пад жывёлаводзтва. Калі якісь з абшарнікаў і займаецца гаспадаркай, дык толькі на малой частцы зямлі, а рэшту здае ў арэнду ці пад працэнты і то на вельмі цяжкіх проста драконаўскіх варунках. Цана на зямлю розная, гледзячы на якасьць яе. Найдаражэй цэніцца зямля пад бульбу ад 60 да 100 пэзасаў (аргэнтынская манэга) за гэктар. Тут на адным і тым самым кавалку зямлі ня сеюць пшаніцы, або жыта, дзеля таго, што вялікая цана на зямлю не дазваляо такой роскашы. Наагул калянiст тут знаходзіцца ў тыраніі фэодалаземляўласьніка і ня можа сеяць таго, што яму падабаецца, ня гледзячы на тое, што плаціць арэнду земляўласьніку.

Мясцовы калянiст тут аседлага жыцьця не вядзе, ён пераходзіць з месца на месца, з правінцыі ў правінцыю. Качоўнае жыцьцё каляніста не залежыць ад яго ўласнай волі, гэта ахвяра тутэйшага аграрнага ладу, па якому земляўласьнікі на доўгі час зямлі ў арэнду не аддаюць. Арэнда цягнецца ня больш года, або двух гадоў у найлепшым выпадку. А калі калянiст застаецца на зямлі, якую арэндуе на даўжэйшы час — дык амаль-што кожны год мусіць рабіць з земляўласьнікам новы кантракт. Праўда, гады чатыры таму назад прыняты парляментам новы аграрны закон, забясьпечываючы арандатару права на час арэнды не карацей як чатыры гады і забараняючы земляўласьніку накладаць арышт на маемасьць арандатара-каляніста. Але закон гэты—толькі міт..., бо кожны земляўласьнік умее вельмі лёгка абыйсьці такі страшны кодэкс, на гэта ў яго заўсёды знойдзецца шмат прычын. То ён хоча пусьціць на зямлю гэту скаціну, то ён хоча даць аддыхнуць ёй і г. д. Так стаіць справа з калянiстам арэндатарам.

Далёка горш з працэнтнікам. Працэнтнік гэта тып каляніста пралетарыя. Гэты калянiст пралетары бярэ зямлю ў абшарніка на год і рэдка калі на даўжэйшы тэрмін і то на варунках розных, але больш-менш такога роду: абшарнік адпускае каляністу пэўную частку зямлі, якую ён павінен узараць, засеіць, сабраць збожжа і змалаціць, даць новыя мяшкі і даставіць абшарніку, або на станцыю чыгункі і ўсё гэта за кошт каляніста; працэнт бывае розны ў залежнасьці ад якасьці зямлі, найчасьцей ад 15 да 30 проц., гэта знача, што ад кожных сто мяшкоў 15 або 30 ідзе на карысьць абшарніка. Бываюць і такія выпадкі, калі калянiст, ня гледзячы на тое, што мае свой уласны насевак — ня мае права абсяваць ім, а мусіць браць яго ў абшарніка і плаціць страшэнна дорага. Калянiст ня мае права таксама трымаць лішняй скаціны ці хатняе птушыны, на гэта земляўласьнікам устаноўлена пэўная норма, а калі калянiст ня прытрымоўваецца гэтай нормы, дык мусіць плаціць штраф некалькімі мяшкамі збожжа, ў залежнасьці ад добрага апэтыту земляўласьніка, або адміністратара. А гэты апошні дык заядае каляніста горш ад тубэркулёзнага мікроба, недастаткаў у каляніста яны знойдуць шмат заўсёды агулам і ў розьніцы.

Так выглядае палажэньне слабага калёніста ў новым сьвеце.

Батракі. Тыповае жыцьцё тутэйшага батрака не такое, як эўрапэйскага батрака ды і менш тут батракоў, як у Эўропе. У паўночна-амэрыканскім клімаце ўвесь час батрак не патрэбен, ён патрэбен толькі ў часе працы на полі, калі батракі пераходзяць з месца на месца, з правінцыі ў правінцыю. У астальны час, калі на полі работа канчаецца, батракі разыходзяцца, хто куды папала: хто ідзе ў места, хто працаваць у лесе або на чыгунку ў рэмонт. Жыцьцё гэтых работнікаў вельмі мізэрнае, іх тут называюць лінжэрамі, што па-нашаму азначае чалавек з торбай на плячох. Есьць і другі тып батрака, гэта тыя, што працуюць у абшарнікаў увесь час і галоўным чынам пры скаціне. Знаходзяцца яны ў абшарніка ўвесь час і з гарадзкім жыцьцём нічога супольнага ня маюць. У разумовым і маральным разьвіцьці яны не далёка адыходзяць ад эўрапейскага селяніна.

Адносіны да эўрапейцаў у Аргэнтыне варожыя, але ня грубыя.

Плян калёнізацыі. Выстаўлена ініцыятыва новага пляну калёнізацыі чыгуначнай кампаніяй, паводле якой калянiстаў маюць саджаць па чыгунках у мала заселеных раёнах. Мясцовая афіцыяльная прэса моцна загаварыла аб гэтым. Было некалькі паседжаньняў у гэтай справе прадстаўнікоў чыгунак і мясцовае адміністрацыі, а на адным з апошніх паседжаньняў быў прысутны навет сам прэзыдэнт рэспублікі, які быў задаволены гэтым праектам і абяцаў падтрыманьне ў далейшым бегу гэтае справы. Урэшце стварылася спэцыяльнае Т-ва калёнізацыі, якое выпрацавала шырокую праграму для помачы і аседлішча новых калёнізатараў.

Магчыма, што наіўны чалавек паверыў-бы гэтай, здавалася-б, добрай думцы аб калёнізацыі аргэнтынскіх магнатаў, якія стараюцца запусьціць свае кіпці яшчэ далей у неабнятыя стэпы Аргэнтыны і выкарыстаць яшчэ ня выкарыстаныя месцы не далёка ад чыгунак. Судзячы па рэформе і па пляну калёнізацыі і ўзяўшы пад увагу якім элемэнтам будуць засяляцца землі пад калёнізацыю, відаць добра, што ангельскія плутократы расстаўляюць сеткі, каб злавіць новую здабычу.

А плян калёнізацыі вельмі заманчывы, бо абяцаюць аддаць зямлю на ўласнае валаданьне калёністам, даць ім крэдыт, памагчы патрэбнымі прыладамі, але дзяржава мусіць даць забясьпечаньне на гэта, а Таварыства само па своему будзе распараджацца калёністамі, якія будуць аддаваць свае прадукты грамадзянству, пакуль ня выплацяць за зямлю...

Але вядома натура галоднага ваўка, як вядомы таксама кракадзілавы сьлёзы ангельскіх лордаў. Але самае цікавае тое, што калёнізацыйнае Таварыства ня будзе насяляць калёнізацыйныя раёны мясцовымі грамадзянамі, або чужынцамі, што пражываюць у краі; не, калёнізацыйнае Таварыства шукае такіх людзей, якія не знаёмы з сытуацыяй краю і якія пакорна будуць гнуць свае сьпіны перад ангельскімі магнатамі.

Дзеля азнаямленьня прывяджу цытату з мясцовае буржуазнае прэсы: — „па дадзеных, якія мы атрымалі consorcio (таварыства) пачне хутка сваю працу, як адно з тых прадпрыемстваў, што мае ўзяцца за правядзеньне пляну калёнізацыі. Гэта ёсьць заходняя чыгунка, якая мае ўжо ў сваім распараджэньні 2.500 гэктараў і здаецца, што на гэту зямлю прывязуць японскіх калёністаў, што знаходзяцца цяпер у Каліфорніі. Другая чыгунка таксама мае вялікі кусок зямлі дзеля калёнізацыі.

Плян жываедаў ясны! Першую спробу калёнізацыі будуць рабіць над японцамі, у той час, як тысячы калёністаў і добрых працаўнікоў для гаспадаркі ня могуць знайсьці зямлі і прылажыць сваіх рук дзеля здабыцьця патрэбных сродкаў істнаваньня. А большасьць людзей стогне пад ярмом ангельскага капіталу.

П. Олейнік.

Buenos-Ajres, 10. III. 27.

*) Польская ўрадавая прэса заклікае беднату, што ня мае магчымасьці зарабіць кусок хлеба ў Польшчы, каб выбіралася ў Аргэнтыну, урад якое прымае эмігрантаў з Польшчы бяз ніякіх перашкодаў. У сувязі з гэтым друкуем гэту карэспандэнцыю чалавека, які жыве даўно ў Аргэнтыне і добра ведае тамтэйшыя варункі.

ХРОНІКА.

Перадвыбарнае ажыўленьне ў Вільні. Як ужо ведама, выбары, новае мястовае рады ў Вільні адбудуцца **19 га чэрвеня с. г.** У сувязі з гэтым ужо распачалася падрыхтоўка да выбараў з боку розных партыяў розных нацыянальнасьцяў.

Асаблівую энэргію выяўляюць буржуазныя партыі. Аднак і сярод работнікаў відаць значную зацікаўленасьць выбарамі — з увагі на тое, што дасюлешняя гаспадарка буржуазнае большасьці мястовае рады зусім ня прымала пад увагу інтарэсаў і патрэбаў працоўных масаў, дый тых часьцін места, дзе жыве пераважна бедната. Відаць зацікаўленьне і сярод беларускага насяленьня Вільні, бо-ж дагэтуль пануючая ў месьце польская і жыдоўская буржуазія абыходзіла навет беларускія дабрадзейныя ўстановы (прытулкі для бедных дзяцей і інш.), якім места не давала ніякае дапамогі, шчодра сыплючы грашмі на розныя нацыяналістычныя польскія і каталіцкія арганізацыі. Беларусы спадзяюцца нейкае зьмены ў адносінах да іх мястовага самаўраду Вільні толькі ў сувязі з уваходам вялікшае лічбы прадстаўнікоў працоўных.

Арганізацыя выбараў. 9 траўня адбылася пад старшынёвам галоўн. выбарн. камісара Лучыньскага першая канфэрэнцыя прадстаўнікоў ураду і самаўраду—у справе арганізацыі выбараў у Раду м. Вільні. Уся Вільня мае быць падзелена на 55 выбарн. участкаў. Аканчальна лічбу радных азначыць мін. унутран. спраў. Спадзяюцца, што іх будзе 52—54. На канфэрэнцыі выясьнілася, што ў часе апошняй перапісі ці перазаяўкі насяленьня места 34.000 асоб не здабылі сабе доваду польскага абывацельства. Дык у выпадках сумліву аб іх выбарных правох будзе рашаць п. камісар ураду. Канфэрэнцыя пастанавіла, каб Магістрат зараз-жа прыступіў да тэхнічнай працы, зьвязанай з выбарамі.

„Новая кар'ера беларускага авантурніка“. Пад такім загалоўкам віленскае „Слово“ зьмяшчае ніжэйпаданую заметку:

„З Менску наказуюць: Ведамы беларускі авантурнік Ластоўскі, які ў свой час, калі стаяў на чале так званага Часовага Беларускага Ураду ў Коўні, створанага за грошы Літвы (?!), арганізоўваў дывэрсыйныя банды на польскай тэрыторыі, — цяпер **перайшоў да бальшавіцкага лагеру** і апублікаваў у Менску **адозву да ўсіх беларусаў-эмігрантаў, заклікаючы іх да падчыненьня савецкаму ўраду**“.

Вельмі характэрна ў гэтай справе тое, што таму-ж самаму „авантурніку“ да ягонага пераезду ў Менск была зроблена прапазіцыя... **перабрацца ў Вільню** і ўвайсьці ў склад рэдакцыі польскае газэты ў беларускай мове пад назовам **„Беларускі Дзень“**. Як апавядала жонка грам. Ластоўскага ў бытнасьць сваю ў Вільні, сябра рэдакцыі гэнае газэты, „ведамы“ эсэр Мамонька, навет вёў з шэфам бясьпечнасьці віленскага ваяводзтва, п. Кіртіклісам, перагаворы аб пропуску для гр. Ластоўскага на прыезд у Вільню... Аднак, на прапазіцыю „Бел. Дня“ гр. Ластоўскі **ня прыстаў** і паехаў у Менск, ня гледзячы на свае раней варожыя адносіны да Радавае Беларусі.

Пасьля гэтага зусім разумеем гнеў „Слова“ і лаянку па адрасу гр. Ластоўскага...

Беларускія артысты. „Głos Prawdy“ ў № 128 з 12 мая зьмясьціў фатаграфію пары артыстаў беларускага тэатру ў Маскве — Кісінай і Платонава. Гэта, здаецца, першы выпадак, што польская газэта паважна адносіцца да беларускага мастацтва наагул. ня гледзячы на тое, што яно разьвіваецца пад уладай работнікаў і сялян.

„Аўтарскі вечар“ адложаны. Праектаваны ў гэту суботу, 14 мая, вечар нашых маладых аўтараў, якія меліся чытаць свае творы ў салі Цэнтральнага Гуртка Т-ва Беларускае Школы ў Вільні, — **адкладаецца на наступную суботу, 21 мая**, дзеля таго, што ў гэту суботу ён зыйшоўся-бы з ладжанай у Віленскай Беларускай Гімназіі вечарынай, да якое зроблена ўжо поўная падрыхтоўка. З другога боку ня ўсе аўтары, якія маняцца выступіць на аўтарскім вечары, здалелі загадзя даставіць рукапісы празначаных да чытаньняў твораў —бо-ж усе творы мусяць перш прайсьці праз цэнзуру камісарыяту ўраду на м. Вільню.

Псаваньне тэлеграфнае сеці. Як падае „Слово“, на тэрыторыі віленскае дырэкцыі чыгунак у апошніх часох было шмат выпадкаў разьбіваньня ізалятараў на тэлеграфных слупох, што выклікала частыя перарывы тэлеграфных зносінаў. Дзеля гэтага віленскі ваявода загадаў старостам, каб паліцыя асабліва пільнавала цэласьці тэлеграфнае лініі ў тых мясцох, дзе пастушкі ганяюць скаціну на пашу каля чыгункі.

Лясныя пажары. Тая-ж газэта паведамляе аб чысьленых лясных пажарах, якія ўзьнімаюцца ад распаліваных пастушкамі вогнішчаў у лясох.

Афіцыяльны курс грошы на 13 траўня. Даляр—8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 60 гр.

13./V. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,90. Зал. р. 4,70. Чырв. 3 дал. 90 цэн.

Ніколі не зьніштажай сваей беларускай газэты! Прачытаўшы, давай суседу, ці знаёмаму, каб і ён пазнаў праўду аб жыцьці свайго народу і даведаўся, што робіцца на сьвеце!

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ

„Вылез з калошы, понимаетели“.

(З сабраньня Беларускай Нацыянальнай Рады ў Дзятлаве).

Зноў пачаў сваю прадажную працу Паўлюкевіч, ловячы момант, калі па гэтых страшэнных арыштах увесь папярэдні рух прыціх. Вылез, понимаетели, з калошы, паглядзеўшы, што кругом нікога пакуль-што няма, трэба скарыстаць з моманту. Вось і хватаюць, як мага, запрашаючы кожнага праўдаю ці няпраўдаю, абяцаючы гутарку аб курсах вучыцельскіх і прыняцьце на іх, але зусім не сабраньня.

Ніколі ня быў і ня чуў яго брахню, дый, думаю, пайду паслухаю, каб мець па трэбнае паняцьце аб добрым, трэба знаць кепскае. І вось, першае, што кідаецца нат' вам у вочы, гэта расейская мова, у якой зьвяртаюцца яны адзін да другога. Няведаем, ці гэта мае быць сабраньне расейцаў, ці беларусаў. Другое, гэта тое, што без паліцыі ані шаг. Бо на гэта сабраньне выдавалі іменныя карткі і больш нікога ня ўпускалі. Некалькі чалавек хацела ўвайсьці, іх ня пусьцілі, на іх трэбаваньне, што на сабраньні, якое адбываецца ў доме людовым, можна ўвайсьці кожнаму, чаму гэта адным карткі даюць, другім не, — быў прыведзены паліцыянт. Усё гэта ясна паказвае, хоць і кажуць яны, што робяць усё дзеля дабра і супакою народнага, як яны баяцца яго, гэтага самага народу, каб ён публічна не сказаў, што здраднікі яны і прадажнікі.

Хто ж быў на гэтым сабраньні? а чалавек 55 — 60 ме' і наскраблі, але паміж імі нераважная частка была польская інтэлігенцыя: паштавікі, сэкратар і пісар суда, адвакаты, вучыцялі польскія і іншыя,—якая, меўшы вольны час у нядзелю, пайшла дзеля правядзеньня часу: ведама, як у мястэчку, навін амаль-што няма.

Ужо даволі было зьвярнуць увагу на інтанацыю самага голасу прамоўцы, каб мець паняцьце аб ўсей яго працы: баязьлівы, няўвераны тон паказвае, што чалавек гэты сам ня верыць у тое, аб чым гаворыць, што робіцца гэта з прымусу, за грошы; што якбы ён не абманваў і колькі-бы чаго не абяцаў, ня можа пайсьці народ за такім павадыром. І нявольна прыпамінаем другіх людзей, дзе іх прамова — сам агонь, каторы адбіваецца ў грудзёх усіх прысутных, змушаючы іх да чыну. А тут, ня могучы даўжэй зьнясьці гэтай ілжы (хоць і так сабраньне цягнулася ня доўга) некалькі чалавек заснулі сабе праведным сном. Бо, мусіць, цікавая была гутарка? А гаварылася на гэтым сабраньні ўсё тое самае, што і заўсёды: тое слова ў слова, што можам прачытаць у газэце „Бел. Слова“ і іх адозвах. Усё гэта гаварылася, каб абмануць гэты народ і разам з тым каб не наступіць на мазоль Польскай Уладзе. Дрэннае гэта становішча, пане Паўлюкевіч, не зайздрошчу табе, вісячаму між зямлёю і небам: некалі як абарвешся, то моцна паб'ешся.

Ну, дык паслухай, як думаюць сапраўды і прапануюць табе сяляне: пакуль яшчэ ня позна, кінь ты гэтае баламуцтва, шлэндацца па вёсках і мястэчках, а займіся сваею доктарскаю працаю: і карысьці больш прынясеш ты народу (калі ты яго запраўды любіш) і падзякі больш будзеш мець; а што да прыяцеляў, то напэўна больш будзеш мець, як цяпер ворагаў. Бо прыхільнікаў шчырых ня знойдзеш сабе на вёсцы, пойдуць адно тыя, каго можна купіць за грошы — а гэта гнілы фундамант, і загоняць цябе ізноў у галёшу ды заточаць, каб ніколі нявылез ужо.

А. Н.

Баіцца страціць пасаду.

(Ярэміцкая гміна, Стаўпецкі павет)

Колькі цярпіць цяпер беларуская вёска, ня маючы свае роднае школы і пасылаючы сваіх дзяцей пад прымусам у польскую ўрадавую школу. Вядомая ўжо рэч, што польскія вучыцялі калечаць беларускіх дзетак маральна (а часам і фізычна). Але калі свой ды зьдзекуецца над сваімі, дык гэта ўжо надта прыкра.

У вёсцы Даўгінаве, Ярэміцкай гміны, Стаўпецкага павету, у польскай урадавай школе ёсьць вучыцель п. З. Мокат. Па нацыянальнасьці ён — беларус. Нат' недалёкі; з суседняе вёскі Вобрыны (дзьве вярсты ад Даўгінова). Ён мае добры кавалак зямлі і не благую гаспадарку. Гэты п. Мокат надта баіцца, каб яго ня зволнілі з пасады польскага вучыцеля, ды ня змусілі жыць ды працаваць на гаспадарцы, дык аж са шкуры выробляецца, каб дагадзіць уладзе. З дзяцьмі, навет і малодшага аддзелу гутарыць папольску, хоць яны мала і разумеюць, а хто папрабуе гаварыць з ім пабеларуску, дык ён крычыць і загадвае гаварыць папольску. Лекцыі беларускае мовы адбываюцца надта нядбала. Беларуская мова слаба стаіць ужо за тым, што выкладаецца толькі два разы ў тыдзень, а тут і гэтыя няшчасныя дзьве лекцыі абрэзываюцца і перапушчаюцца надта часта, а ў малодшай кляве заместа таго, каб выкладацца часьцей, выкладаецца нешта раз на тыдзень, а і тога менш. Дзеці малодшага аддзелу самі цікавяцца беларускімі кніжкамі і прыносяць іх у клясу, але чытаць іх то пан вучыцель забараняе і загадывае ім хаваць іх у лаўку, а замест беларускіх суне дзецям польскія, хоць яны ня ўмеюць, ды ня хочуць іх чытаць. Дзеці не разумеюць польскае мовы і ня могуць добра прыгатаваць лекцыяў, якія задаюцца папольску. А пан вучыцель зьдзекуецца над імі: калі яны ня ўмеюць лекцыі, б'е іх лінейкай па руках, б'е па твары і трасе за вушы. Асабліва ён ня любіць, калі хто з дзяцей возьме ў клясу кавалачак хлеба. Аднэй сямёхгадовай дзяўчынцы, Лізе Варэнікавай, калі яна ела ў клясе хлеб, ён пхаў у рот анучай, што дашку сьціраць. Дзецям не пазваляе ў клясе пяяць беларускія песьні, а хто ня слухае, б'ецца і лаецца. Асабліва ён ня любіць беларускіх палітычных партыяў, Грамаду (яшчэ да зьліквідаваньня яе) лаяў з апошніх слоў; кажа, што гэта ўсе бальшавікі арганізуюць яе, ды бальшавікі ў яе і запісваюцца. Вось як ён казаў дзецям пра грамадаўцаў: „Ганеце гэтых баранаў дурных разам з каровамі на пашу“.

Дык вось, якія вучыцялі сядзяць у нашых вёсках і праводзяць польскую культуру! Мала ёсьць такіх, якія добра адносяцца да дзяцей і наагул да ўсяго беларускага грамадзянства. Няма, дзіва, калі польскія вучыцялі ненавідзяць беларускіх дзяцей і зьдзекуюцца над імі, але як ня сорамна свайму ды так скакаць пад чужую дудку!

Стаўпецкі.

Два „агітатары“.

(м-ка Казлоўшчына, Слонімскага павету).

Пасьля ліквідацыі „Грамады“ розныя цёмныя шэршні пачалі лезьці на нашу працоўную вёску, каб скарыстаць з хвілёвага замяшаньня сялян і павесьці іх па згодніцкай, прадажнай, дэфэнзыўнай дарозе. Юдавыя срэбнікі пасыпаліся з добра цяпер авансаванага мяшка Паўлюкевіча. У некаторых мяйсцовасьцях, як напр. і ў нас у Казлоўшчыне, удаецца „вялікаму махляру беларускай зямлі“ Паўлюкевічу падмануць за прадажныя грошы пару „підбрэхавічаў“. Гэтым разам у нас папалі на вудачку два, гэта: „рыжы“, як яго завуць кругом па вёсках, Хвёдар Лішык з вёскі Бяніцкаўшчына і Іван Гародка з Драбавіч, якія зрабіліся платнымі агентамі „агітатарамі“ і за што? за абяцаньні. Хв. Лішык даўно лятуцее аб пасадзе на пошце, дык вось Паўлюкевіч яму абяцаў дастаць яе, а цяпер пакуль што дае яму „пэнсію“ — некалькі злотых у месяц. Ів. Гародка сьніць аб вучыцельскай пасадзе, хоць кваліфікацыі ня мае, але Паўлюкевічу гэта нічога ня значыць, абы „свой“ хоць і нуль, абяцае пасаду.

І вось гэтыя агітатары, спаткаўшы ў Казлоўшчыне на кірмашы якога знаёмага селяніна, цягнуць яго да жыда ў крамку і там угаварываюць, каб падпісалі розныя заявы. Так яны цягнулі селяніна А. з Скіпоравіч і шмат другіх. Звычайна сяляне заўсёды адказываюцца падпісываць, бо Паўлюка ўсе добра знаюць. За ўвесь час іхняй „працы“ (гэта будзе каля месяца) ім удалося падмануць толькі шэсьць чалавек, якія ўжо на днях выпісываюцца.

Браты Сяляне!

Ці-ж вам не вядома праца прадажніка Паўлюкевіча? Ці-ж не вядома яго дэфэнзыўная праца?

Байкатуйце іх!

Ня месца ім здраднікам працоўных пасярод нас!

Гром.

Дарагі сабака.

(Горадзенскага павету).

Грамадзянін вёскі Карневічы, Горніцкае гміне, Горадзенскага павету. Сыльвэстар Баран у кастрычніку мінулага году вёў свайго старога сабку да „гыцля“ ў Горадню, каб пазбыцца яго. У вярстох трох ад яго вёскі па дарозе ў напрамку да Горадні сустрачае яго паліцыянт Капцёўскага пастарунку, Заманчынскі і, зьвярнуўшыся да грам. Барана „czemu pies jest nie przywiązany“? — зачаў пісаць пратакол. Селянін зачаў тлумачыцца, што ён вядзе сабаку забіць, і што панок можа яго застраліць, і гэтым самым няпрыдзецца яму цягнуцца ў такую далёкую дарогу; але паліцыянт і слухаць не хацеў (вядома: яму патрэбен пратакол, каб даказаць начальству, што ён працуе і што незадарма хлеб есьць)...

Так прайшло добрых паўгода, пакуль гэты пратакол вандраваў па паліцэйскіх і судовых установах. Аж цяпер раптам прыходзіць назад, абярнуўшыся ў форму наказа на 11 зл. штрафу... І за што спытацца? а тымчасам настае рабочая пара, трэба абсяваць поле, а ў гэтага селяніна толькі і ёсьць два пуды семя для абсеву.

Вось цяпер і рабі, што хочаш: прыходзіцца апошняе семя прадаваць, каб заплаціць гэты штраф, бо пісар у воласьці кажа, што, як не заплоціш, то спагоні́м „drogą sekwestracyjną“.

Молат.

За што караюць.

(Дзісенскі павет).

Солтыс Чаўнічанскі атрымаў праз Мікалаеўскую воласьць ад старасты Дзісенскага павету загад сьцягнуць з бацькі пасла Мятлы 50 зл. адміністрацыйнае кары за нелегальнае трыманьне амуніцыі. А справа вось у чым: У дзень арышту пасла Мятлы дома ў яго на вёсцы быў вобыск. Знашлі (вось каб Обст ведаў, прызнамся было-бы пісаць аб чым у „Dzien. Wil.“) цэлы склад „amunicji bojowej“, — адну старую кабуру ад нагана, астаўшуюся яшчэ ад сусьветнай вайны. І пры розных вобысках пры немцах, пры бальшавіках і пры паляках ніхто і ўвагі не зьвяртаў на гэту кабуру. Аж цяпер Дзісенскі староста скарыстаў з аказіі, каб пакараць бацьку пасла Мятлы — 80-гад. старыка. Выходзіць па суду старасты, што бацька пасла мусіць адказываць за сына, які калісь меў няшчасьце служыць у расейскай арміі афіцэрам і па праву меў уласны наган у скуранай кабуры. Немцы наган забралі, а кабуру пакінулі, як непатрэбшчыну. А цяпер за гэту самую кабуру трэба плаціць Дзісьненскаму старасту аж 50 зл. кары. Трэба адзначыць наагул, што Дзісьненскі староста надта любіць сьцягіваць адміністрацыйныя кары. У гэтым выпадку ён мусіць апярэдзіў усіх сваіх калегаў.

Два сьвяты.

(Беніца, павет Маладэчанскі).

Калі надыходзіў 1-шы май, нашым паном, мала аказалася 16-ці чал. сваей паліцыі, дык яшчэ прыгналі роту палявой паліцыі. Перад 1 ае маем увечары палявая паліцыя расеиалася па ўсіх вёсках і дарогах гэтае гміны. Хадзілі, прыглядаліся — усё роўна як „бусел па балоце ходзячы“. Хоць, здаецца, пільна сьцераглі „когось“, але не ўсьцераглі, бо ў м. Маркаве быў вывешаны вялікі чырвоны сьцяг з надпісам „звальненьня наслоў нашых і палітычных вязьняў дамагаемся“! У в. Яляньцы таксама быў вывешаны сьцяг і такі лозунг, а таксама шмат дзе яшчэ. Але да сьвяткаваньня Сьвята Працы не дапусьцілі.

А сьвята 3 га мая адбывалася вельмі ўрачыста. Папрыяжджалі ўсе паны і паўнанкі, як напрыклад Дэмскі, Асіновіч і другія, якія гаварылі прамовы, хоць, апрача паліцыі ды другіх панкоў, мала хто і слухаў. А калі пачаў казаць прамову Дэмскі, то некатарыя грамадзяне сталі крычаць: „нятак,— нятак, нам гэтага ня трэба“. Дык тут камандант прастарунку, Мацке выгнаў і тых з салі. Было падстаўленьне але таксама былі толькі панкі. А на скокі, дык усю гміну аб'яжджалі, пакуль нашлі музыкантаў: ніхто не хацеў ісьці іграць.

Як вы паночкі ня хваліцеся 3-м маем і лепшай мінуўшчынай, — але ў народзе жыве сьвята 1-га мая.

Ал.

Хто вінаваты?

(М. Скідэль, павет Горадзенскі).

Нядаўна ў м. Скідлі адбыліся перавыбары солтыса, ці па ўрадаваму — віцэ-бурмістра. Большасьцю аднаго голасу быў выбраны чалавек, які заслугоўвае даверыя,.. паліцыі, ды які нямілы ўсяму грамадзянству. Але як гэта здарылася так, што сяляне выбралі на солтыса такога чалавека, які ўсім рашуча не падабаецца? А дзеля таго, што добрыя людзі не хацелі браць на сябе гэткага абавязку, а па другому затым, што сяляне ня маюць цьвёрдасьці і нядбайна адносяцца да справы.

І мы жалімся на тое, што нам кепска жывецца... Дык хто-ж найбольш вінаваты, калі ня мы самі, калі самі аддаем свае ўласныя справы ў рукі людзей, якія прадаюць іх у рукі паліцыі?!

Сатурн.

З Т-ва Бел. Школы.

Да ведама ўсіх сяброў Т-ва Беларускае Школы.

28 мая ладзіцца паміnаньне беларускага паэта Максіма Багдановіча ў зьвязку з дзесятымі ўгодкамі ягонай сьмерці. Усе Гурткі Т-ва Бел. Школы маюць правясьці на мясцох гэтае памінаньне. Галоўная Управа разашле дзеля гэтага рэфэраты аб Багдановічу, якія будуць надрукаваны ў месячніку „Родныя Гоні“, а таксама зборнік твораў песьняра і партрэт яго. Гурткі на мясцох хай толькі выкарыстаюць добра ўсё ім прысланае і хай загадзя зробяць захады перад мясцовымі ўладамі дзеля наладжаньня памінаньня на мясцох.

Дык помніце-ж грамадзяне! Споўніце свой абавязак!

Да Галоўнае Управы Т-ва Белар. Школы ў Вільні.

Паважаныя грамадзяне.

21.III. г. г., якраз перад днём адчыненьня бібліятэкі-чытальні ў вёсцы Крывой, Пасынскае воласьці, Бельскага павету мясцовая паліцыя забрала бібліятэку і сяброўскія білеты Т-ва Беларускае Школы. Па білеты прыходзілі два паліцыянты ў кожную хату, трэбуючы здачы сяброўскіх білетаў, а хто адмаўляўся, таго змушалі шукаць, а потым і самі ўзяліся за гэту работу і шукалі па ўсіх будынках. На руках ў сяброў засталіся толькі такія білеты: № № 2358, 2362, 2381, 2385. Пры гэтых вобысках былі бедныя ўсе беларускія друкі. Беларускія газэты, адозвы і часопісь „Маланку“ проста вырывалі з рук і рвалі на дробныя шматочкі, кажучы, што ўсе гэтыя друкі нелегальныя. Засталіся цэлымі толькі канцэлярскія паперы і то мусіць толькі таму, што не папалі паліцыі на вочы.

Калі я стала спрачацца і даказваць, што яны ня маюць права так рабіць, дык пан Дзехцярскі пачаў страшыць якімісь артыкуламі і кратамі.

Пасьля гэтага я некалькі разоў заходзіла на пастарунак, каб аддалі ўзятыя ў нас паперы, але камандант пастарунку сказаў, што гэта не яго справа, што ўсё забранае ў нас пашло ў староства і што староства само, што захоча, тое і зробіць з гэтымі паперамі. Найважнейшаю стратаю для нас зьяўляецца тое, што забралі ўсе кніжкі ў бібліятэцы-чытальні, ня гледзячы на тое што ўсе яны легальныя і прайшлі ў свой час праз цэнзуру. Гэтай страты мы ніяк ня можам перанясьці, бо наш куток вельмі цёмны і бібліятэка наша давала нам вельмі шмат духовае стравы

Застаюся з пашанай да Т-ва Белар. Школы Н. Кандрацюк.

Адрэс: poczta Bielsk-Podlaski, gmina Pasynki, wieś Krzywa Nadzieja Kondraciuk.

Беларусы ў Літве.

Прапазыцыя літоўскіх фашыстаў.

Як падае польская прэса, літоўскі фашыстаўскі ўрад, выкінуўшы з Літвы грам. Ластоўскага, пачаў шукаць сабе яшчэ больш „пакорнага“ беларуса, які-б супрацоўнічаў з Літвой у кірунку зьдзейсьненьня літоўскіх лятуценьняў аб Вільні. З гэтай мэтай фашысты быццам зьвярнуліся да былага пасла Якавюка, які ўцёк з Польшчы, прапануючы яму склікаць беларускі эміграцкі зьезд, ды ад імя гэнага зьезду падтрымаць Літву ў яе дамаганьні Вільні, а за гэта Літва мае падтрымаць незалежніцкія імкненьні Беларусі...

Ці знойдуцца наіўныя, якія пойдуць на овую камэдыю—падобную да зробленае некалі гр. Ластоўскім „аддачы“ Літве Вільні „ад імя Беларускага народу“,—мы ня ведаем. Ме галодных эмігрантаў, якіх за межамі Бацькаўшчыны асталося ўжо вельмі мала, і ўдасцца „купіць“. Ды ня хочацца верыць, каб навет такога сорту „беларус“, як грам. Якавюк, згадзіўся іграць у літоўскіх фашыстаў ролю... „мішурыса“!

Беларусы ў Латвіі.

5-цігодзьдзе Дзьвінскае Белар. Гімназіі.

Як ведама, падрыхтоўчая праца да адчыненьня Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі ў Дзьвінску пачалася з 1 красавіка 1922 г., калі захадамі Т-ва „Бацькаўшчыны“ на пасаду дырэктара-арганізатара гэтае гімназіі быў прызначаны Латвійскім урадам вядомы беларускі дзеяч, гр. Ян Ігнатавіч Краскоўскі.

З восені 1922 году ў гімназіі распачаліся заняткі, адразу ў 4-х клясах.

Гэтай вясной 1. IV. 27 ужо скончылася 5 гадоў, як быў пакладзены пачатак арганізацыйнае працы. Гэткім чынам, пры канцы 1926-27 навучальнага году спаўняецца 5 гадоў працы гімназіі і гімназія зробіць ужо 5-ты выпуск сваіх выхаванцаў.

З гэтага поваду на 28-е траўня школьная рада гімназіі прызначыла дзень сьвяткаваньня 5-ці гадавага юбілею гімназіі.

Сьвяткаваньне пачнецца ўрачыстым актам, пасьля якога адбудзецца вечарына і юбілейная выстаўка, ёсьць думка выдаць друкаваную памятную кніжку.

Усячына.

Дзяржаўныя даўгі Польшчы.

Пад гэтакім загалоўкам у газэце „Dziennik Kresowy“ ад 28/IV 27 г. была зьмешчана цікаўвая заметка, што ў Польшчы ёсьць даўгоў на агульную суму 3,572,095,317 зл., ці, інакш кажучы, на галаву кожнага грамадзяніна Польскае Рэспублікі прыпадаець па 132 зл.

Хто чытае нашу газэту і не прысылае падпіскі, той ня спрые разьвіцьцю роднай беларускай прэсы.

БРАТЫ! Прысылайце падпісную плату, а хто задоўжыўся, выраўняйце свой доўг.

Рэдактар-Выдавец: С. Татарын

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.